ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
26
ЛЮТАГА
ЧАЦВЕР

№ 7(1528)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі ўніверсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### Вечар

інтэрнацыянальнай дружбы, прысвечаны Дню Дэмакратыі і Дню Герояў Непала, адбыўся ў БПІ. Яго адкрыў старшыня зямляцтва студэнтаў Непала Махато Упендра. Ён расказаў студэнтам з Афганістана, Анголы, В'етнама, Сьера-Леоне пра сваю невялікую краіну, пра тую нялёгкую барацьбу, якую вядуць прагрэсіўныя сілы.

З прывітаннем і найлепшымі пажаданнямі ў барацьбе за незалежнасць і веды выступілі прарэктар па міжнародных сувязях БПІ А. Грэбнеў, прадстаўнік гарсавета па рабоце з замежнымі студэнтамі А. Волчак, дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна А. Раковіч, намеснік сакратара камітэта камсамола БПІ В. Гулькові́ч, прадстаўнікі зямляцтваў студэнтаў Афганістана, В'етнама, Анголы.

А. ГУЛЕЙЧЫК.

### Прыём

папярэдніх заказаў на 1988 год пачаў кніжны кіёск, які знаходзіцца ў галоўным корпусе універсітэта. Азнаёміўшыся з планамі выпуску літаратуры цэнтральных і рэспубліканскіх выдавецтваў, вы маеце магчымасць своечасова аформіць заказ на літаратуру, якая вас зацікавіць.

Ж. КРУГЛІКАВА.

### «Ювентас-87»

— так называўся міжрэспубліканскі агляд-конкурс самадзейных акадэмічных хораў ВНУ краіны, які праходзіў з 4 па 8 лютага ў г. Каўнасе. Універсітэцкая народная харавая капэла (хормайстар М. Лапкоўская) вярнулася дадому з прызамі за лепшае выкананне народнай песні. Лепшым салістам конкурсу прызнаны супрацоўнік філалагічнага факультэта Алег Атамановіч.

І. МАЦЮКОЎ,
мастацкі кіраўнік народнай капэлы.

### 250 выданняў

— гэта не поўная лічба выданняў, уключаных у план выпуску на 1988 год буйнейшага ў краіне Выдавецтва палітычнай літаратуры ЦК КПСС. Усе кнігі, брашуры, выхад якіх чакаецца ў наступным годзе, могуць быць заказаны ўжо сёння. Гэтую паслугу акажа магазін № 28 «Палітычная кніга» (вул. К. Маркса, 35).

І. ІВАНОВА.

*спадчына*

## ПУШКІН І НАШ ЧАС

**ПАЎТАРА СТАГОДДЗЯ МІНУЛА З ТАГО МОМАНТУ, КАЛІ НА ЧОРНАЙ РЭЧЦЫ ПРАГУЧАЎ ПОДЛЫ СТРЭЛ, АД ЯКОГА ЗАГІНУЎ ПАЭТ. ЗА ГЭТЫ ЧАС ПА НЕЗАРАСТАЮЧАЙ СЦЯЖЫНЕ ДА НЕРУКАТВОРНАГА ПОМНІКА АЛЯКСАНДРУ СЯРГЕЕВІЧУ ПУШКІНУ ПРАЙШЛІ МІЛЬЁНЫ І МІЛЬЁНЫ ЛЮДЗЕЙ.**



З ТАГО дня духоўная гісторыя нашага грамадства развіваецца пад знакам роздуму аб Пушкіне, Бялінскі заўважыў: Пушкін належыць да тых з'яў, што вечна жывуць і рухаюцца, не спыняюцца на той кропцы, на якой сустрэла іх смерць... Кожная эпоха выказвае пра іх сваё меркаванне, як бы слушна ні зразумела яна іх, але заўсёды пакіне для наступнай эпохі сказаць што-небудзь новае і больш слушнае, і ні адна і ніколі не выкажа ўсяго.





Што ж гаворыць пра Пушкіна наша эпоха, наш час? Як сведчыць пра сваю сувязь з паэтам? Пушкінскія музеі... Пушкінскія запаветныя мясціны... Міхайлаўскае, Болдзіна, Масква, Ленінград...— да іх не зарасце народная сцяжына.

У лютым гэтага года па ўсёй нашай краіне праходзяць Дні памяці паэта. Дзень памяці пад назвай «Пушкін і наш час» адбыўся і на філалагічным факультэце.

Уступным словам яго пачаў доктар філалагічных навук прафесар Павел Іванавіч Ткачоў. З дакладам «Пушкін у адзінамастацкай канцэпцыі Я. Коласа» выступіў доктар філалагічных навук прафесар Алег Антонавіч Лойка.

У канферэнцыі таксама прынялі ўдзел даследчыкі творчасці вялікага рускага паэта з Мінскага інстытута культуры, Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР, аспіранты і маладыя выкладчыкі, студэнты.

Праз Пушкіна мы спазнаём саміх сябе. І, напэўна, гэта праблема самаспасціжэння для нас зараз асабліва патрэбная і вострая.



І. РУСЕЦКАЯ,
студэнтка
філалагічнага
факультэта.
Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

*абмяркоўваем праект Статута ВЛКСМ*

## ПРАШУ СЛОВА

**ХАЧУ ЎНЕСЦІ НЕКАЛЬКІ СВАІХ ПРАПАНОЎ ПА ЗМЯНЕННЮ І ДАПАЎНЕННЮ НЕКАТОРЫХ АСНОЎНЫХ ПАЛАЖЭННЯЎ ПРАЕКТА СТАТУТА ВЛКСМ.**

1. Пункт 2 (§ 1) дапоўніць палажэннем: «Беражліва адносіцца да здабыткаў нацыянальнай і сусветнай культуры, з павагай ставіцца да гістарычнай спадчыны савецкага народа, садзейнічаць яе збераражэнню і захаванню, аберагаць прыроду».

Заўсёды з болем у сэрцы даводзіцца чытаць розныя надпісы на сценах старажытных помнікаў архітэктуры. І як, здаецца, падымаецца рука ў таго ці іншага маладога чалавека, поўнага сіл і энергіі, вывесці фарбай на мурах, скажам, Мірскага замка надпіс «Тут быў Вася з Пухавіч»? Чаго варты такі камсамолец? Яму ўсё адно, дзе і што пісаць, затое ўсе будуць ведаць, хто тут быў.

Таму лічу, што такое палажэнне ў Статуце проста неабходна.

2. Шмат каму з членаў ВЛКСМ прыходзіцца звяртацца ў вышэйстаячыя камсамольскія органы з рознымі заявамі і прапановамі. Часам вельмі доўга даводзіцца чакаць, калі дадуць адказ. Таму ўношу прапанову у пункце 3 (§ 1) пасля слоў «камсамольскія органы абавязаны чуйна і ўважліва разглядаць заявы і прапановы членаў ВЛКСМ» запісаць «у найкарацейшы тэрмін даваць на іх адказы і» — далей па тэксту.

С. ГАЛОЎКА.

*пасля выступлення «Беларускага універсітэта»*

## «Ходу няма!»

У НАТАТКАХ «Ходу няма!», апублікаваных 27 лістапада 1986 года, ставілася пытанне аб неабходнасці адкрыць ход з боку прывакзальнай плошчы. Нам адказвае прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце У. І. Тарасевіч:

«Год назад на рэктараце было прынята рашэнне, каб закрыць пераход з боку прывакзальнай плошчы праз тэрыторыю універсітэта. Рашэнне гэта было выклікана тым, што ва універсітэце здараліся выпадкі крадзяжу асабістых рэчаў студэнтаў і выкладчыкаў, неаднаразова ў падвальных і паддашкавых памяшканнях вучэбных карпусоў начавалі і распівалі спіртныя напіткі пабочныя асобы.

У цяперашні час прыток чужых асоб на тэрыторыю універсітэта скараціўся, таму кіраўніцтва адміністрацыйна-гаспадарчай часткі лічыць прынятыя меры правільнымі».

# ПРАГРАМА ПАСКАРЭННЯ

*закон і ты*

юрыдычных, эканамічных і іншых навук. Тут адкрываюцца новыя магчымасці для плённых даследаванняў як тэарэтычнага, так і прыкладнога характару.

Праграма паскарэння датычыцца не толькі эканомікі, адзначалася на з'ездзе партыі. Гэта праграма ахоплівае ўсе бакі жыцця савецкага грамадства, мае на ўвазе далейшае ўдасканальванне грамадскіх адносін, паглыбленне і развіццё сацыялістычнай дэмакратыі. Таму мясцовыя Саветы народных дэпутатаў закліканы стаць адным з найбольш эфектыуных звёнаў мабілізацыі мас на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. У сувязі з гэтым заслугоўвае больш уважлівага вывучэння практыка ўдасканальвання дзейнасці мясцовых Саветаў па забеспячэнню комплекснага эканамічнага і сацыяльнага развіцця.

Мясцовыя Саветы закліканы ў поўнай меры выкарыстоўваць вялікія правы, якія ім даюцца. Аднак выкарыстоўваць правы можа толькі работнік выканкома, які ведае, як гэта зрабіць. Таму часам выклікае заклапочанасць той факт, што ў апараце выканкомаў мясцовых Саветаў нашай рэспубліке недастаткова работнікаў з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй. Адсюль — неразуменне часткай савецкіх работнікаў духу і літары закона, прыняцце незаконных рашэнняў і іншыя хібы ў дзейнасці па прымяненню права. Каб ліквідаваць гэтыя негатыўныя з'явы, неабходна, на нашу думку, ажыццявіць наступныя меры:

увесці замяшчэнне шэрагу кіруючых пасад у выканкомах мясцовых Саветаў асобамі, якія маюць вышэйшую юрыдычную адукацыю;

накіроўваць у планавым парадку больш выпускнікоў юрыдычных ВНУ, якія праходзяць спецыялізацыю па дзяржаўнаправавому цыклу, на работу ў апарат выканкомаў;

палепшыць вывучэнне пытанняў савецкага будаўніцтва на рэспубліканскіх курсах павышэння кваліфікацыі партыйных і савецкіх работнікаў пры Мінскай вышэйшай партыйнай школе і на аналагічных курсах пры абласных камітэтах партыі.

Трэба больш праводзіць навуковых эксперыментаў у галіне савецкага будаўніцтва. Такія эксперыменты, як паказвае вопыт іх правядзення вучонымі юрыстамі юрыдычных ВНУ нашай краіны, маюць высокія пазнавальныя магчымасці, з'яўляюцца дастаткова эфектыўным метадам адкрыцця пэўных заканамернасцей, дазваляюць вызначыць, у якім напрамку павінна быць забяспечана прававое рэгуляванне тых ці іншых грамадскіх адносін.

На XXVII з'ездзе КПСС востра было пастаўлена пытанне аб барацьбе з непрацоўнымі даходамі. Вядома, што некаторыя людзі жывуць не па сродках, у абход закона атрымліваюць розныя даброты. Пастаўлена задача: ажыццявіць прававыя і іншыя меры, накіраваныя супраць дармаедаў, раскрадальнікаў сацыялістычнай уласнасці, хабарнікаў, супраць тых, хто стаў на шлях, чужы прыродзе нашага ладу. Выконваючы ўстаноўкі з'езда, ЦК КПСС і Саветам Міністраў СССР прынята пастанова «Аб мерах па ўзмацненню барацьбы з непрацоўнымі даходамі». Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР унесены адпаведныя змяненні, якія датычацца ўзмацнення барацьбы з атрыманнем непрацоўных даходаў, у заканадаўчыя акты.

У нашай дзяржаве ахоўваць правы і свабоды грамадзян закліканы ўсе дзяржаўныя органы, грамадскія арганізацыі і службовыя асобы. Асобая роля належыць суду. Як адзначалася ў Палітычным дакладзе ЦК КПСС, неабходна «у бліжэйшы час закончыць падрыхтоўку прадугледжанага Канстытуцыяй закона аб парадку абскарджання ў суд неправамерных дзеянняў службовых асоб, якія ўшчамляюць правы грамадзян». Падрыхтоўка і прыняцце такога закона, на нашу думку, цалкам адпавядала б указанню У. І. Леніна аб неабходнасці «надання кожнаму грамадзяніну права праследаваць любога чыноўніка перад судом, без скаргі па начальству». Пашырэнне судовай аховы правоў грамадзян — праяўленне далейшага развіцця дэмакратыі на этапе развітога сацыялізму.

Павышэнне эфектыўнасці і якасці ажыццяўлення правасуддзя па грамадзянскіх і крымінальных справах — адзін з актуальных напрамкаў савецкай юрыдычнай навукі. У сучасных умовах, калі ў цэнтр работы ўсіх партыйных, савецкіх і гаспадарчых органаў пастаўлена задача па вышукванню і прывядзенню ў дзеянне ўсіх рэзерваў павышэння эфектыўнасці вытворчасці, даследаванні ў гэтым напрамку для беларускіх вучоных-юрыстаў набываюць асаблівую тэарэтычную і практычную значнасць. Далейшае павышэнне эфектыўнасці дзейнасці судоў сёння ўжо не можа быць забяспечана толькі мерамі экстэнсіўнага характару — за кошт павелічэння колькасці народных судоў, суддзяў і г. д. Тут, відаць, як і ў народнай гаспадарцы, трэба больш смела пераходзіць да інтэнсіўных метадаў работы.

На жаль, яшчэ не адзінкавыя выпадкі парушэння сацыялістычнай законнасці пры расследаванні і судовым разглядзе крымінальных спраў. Кожны з іх, кім бы ён ні дапускаўся, павінен атрымліваць прынцыповую, вострую ацэнку, быць сурова асуджаны. Гаворка ідзе пра людзей і іх лёс, пра захаванне прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці. Ленінскі наказ «не дапускаць ні ценю адступлення ад нашых законаў» захоўвае актуальнасць у поўнай меры.

Пры сацыялізме правы грамадзяніна не існуць і не могуць існаваць без яго абавязку. Разам з тым у апошнія гады мы больш сталі гаварыць і пісаць аб правах і менш — аб абавязках. Уяўляецца, што такі «перакос» недапушчальны. Для правільнага разумення суадносін правоў і абавязкаў неабходна зыходзіць з таго, што ў сацыялістычным грамадстве выкананне абавязкаў — гэта ўдзел у забеспячэнні сваіх жа правоў. Ажыццяўленне правоў неаддзельнае ад выканання абавязкаў.

Трэба прызнаць, што вучоныя-юрысты не заўсёды канцэнтруюць сваю ўвагу на найбольш актуальных пытаннях дзяржавы і права. У прыватнасці, яшчэ недастаткова праводзяцца навуковыя даследаванні па такіх праблемах, як права і навукова-тэхнічны прагрэс, права і эканоміка, сацыяльная каштоўнасць і права.

У святле сучасных патрабаванняў беларускім вучоным-юрыстам сёння неабходны новы якасны зрух у навуковых даследаваннях. І уклад у рэалізацыю намечанай партыяй праграмы паскарэння павінен быць больш важкім.

**В. ЦІХІНЯ,**
дэкан юрыдычнага факультэта,
доктар юрыдычных навук.

*З пошты*

## «Мама прыйшла!»

У СТУДЭНТКІ юрыдычнага факультэта Алы Стрыга шмат спраў. Кожны дзень надоўга затрымліваецца яна ў камітэце камсамола. Арганізацыя цікавага жыцця групы, дзе Ала старастай, таксама патрабуе часу. Яна ўсё ж знаходзіць хвілінку, каб прыйсці да іх, выхаванцаў дзіцячага дома № 2 г. Мінска. Цяпер ужо няма спраў, якія б не кранալі яе ў гэтым доме. А пачалося ўсе са студэнцкага камуністычнага атрада імя «3 ліпеня», камандзірам якога ёй давялося быць. Дарэчы, сярод камуністычных атрадаў Мінскай вобласці яны занялі першае месца.

Шмат чаго можа расказаць Ала аб працы ў дзіцячым доме. Неаднаразова прыходзілася працаваць без адпачынку па некалькі дзён, бо не хапала выхавацеляў. За невялікі, здаецца, тэрмін змагла адшукаць сцяжынку да кожнага са сваіх выхаванцаў. Ці магчыма гэта зрабіць за такі кароткі час? Магчыма! Дзеці адразу добра адносяцца да чулых, уважлівых людзей, якія хоць на нейкі час могуць замяніць ім маці.

У поўныя клопатаў дні прыходзілася займацца і грамадскімі справамі. На агляд мастацкай самадзейнасці, які праводзіў гарадскі штаб, прыйшла толькі яна. Усе астатнія працавалі. На запытанне рашуча адказала: «Будзем выступаць!»

І мала хто мог стрымаць здзіўленне, калі на сцэну ад імя атрада «3 ліпеня» паднялася адна дзяўчына. І заспявала. Смех скептыкаў адразу заціх, бо не мог не крануць сэрца прыемны голас спявачкі.

Аб тым, чым яна будзе займацца летам, Ала ведае з мінулага года. Зноў будзе працаваць у дзіцячым доме. На заробленыя грошы ў новым працоўным семестры байцы атрада збіраюцца падарыць дому аўтобус. І ўжо зараз Ала з загадчыцай дзіцячага дома № 2 клапоцяцца пра гараж для яго.

А дзеці? Трэба было бачыць іх радасныя ўсмешкі...

**Р. ЯХНАВЕЦ.**

# ЗДЫМІЦЕ КАПЯЛЮШ

*У заключэнне некалькі слоў на тэму, дзеля якой і называлася імя Ігара: якім быць студэнту? Вядома — розным. Хацелася б, аднак, каб больш было студэнтаў ведаючых. Іх цяпер катастрафічна не хапае. Не спрыяе ім атмасфера ў студэнцкіх групах. Сучаснаму Міхайле Ламаносаву, заявіся ён у цяперашнюю «альма матэр», давялося б нялёгка.*

*Мы — хто бягом, хто бокам, а хто і паўзком — ужо увайшлі ў практычную журналістыку. І паверце нам, былым «хвасцістам» — вы, цяперашнія: вельмі не хапае ведаў, шмат часу ўпушчана, страчана ўпустую. Размова ідзе не аб старанным вывучэнні праграмы. Мы, як і раней, лічым, што любая адукацыя — гэта, перш за ўсё, самаадукацыя. Не хапае ведаў па гісторыі, культуры. А без гэтых ведаў не можа быць цяпер па-сапраўднаму адукаванага чалавека. На шчасце, у апошні час цікавасць да гісторыі, культуры свайго народа ўсё больш абуджаецца ў людзях. Не прайдзіце міма, таварышы студэнты!*

*Самаадукацыя — забава на тыдзень, калі ў цябе няма мэты. Шукаць людзей мэтанакіраваных, абуджаць мэтанакіраванасць — вось, на наш погляд, справа, вартая маладзёжнай журналістыкі».*

*Дзевятнаццаць подпісаў.*

ГЭТА ПІСЬМО мае права з'явіцца ў газеце. Гэтак жа, я лічу, можа мець месца і мой адказ яго аўтарам.

Я буду прытрымлівацца вашага тону, вашага настрою. Нікога не абвінавачваючы, не апраўдваючы, не апраўдваючыся, паспрабую ў нечым разабрацца сама і нешта растлумачыць вам.

Такім чынам...

Друкаванае слова — зброя. І сродак па сіле ўздзеяння (маю на ўвазе маральнае) — амаль не пераўзыдзены. Можна ўзвесці на п'едэстал і з яго ж скінуць, можна абліць гразёй ці ўзнагародзіць вянком вялікамучаніка, можна абнадзеіць ці пазбавіць усялякай надзеі, можна абудзіць гардыню, усыпіць пільнасць, падліць масла ў агонь... Можна працягнуць саломінку ці выбіць глебу з-пад ног. Колькі таму прыкладаў... Якая адказнасць кладзецца на цябе, калі ты бярэшся за пяро, каб судзіць! Аб рабоце журналістаў кажуць: «пакуты творчасці». Я дадала б: і пакуты сумлення. Калі карпееш над словам ці радком, думаеш у першую чаргу не аб тым, каб выйшла прыгожа, а аб тым, каб праўдзіва, правільна. І ўсё ж суб'ектыўная афарбоўка характэрна для любой газетнай публікацыі, як бы аб'ектыўна ні былі адлюстраваны факты. Усё залежыць ад таго, з якога боку зірнуць на прадмет (ці чалавека). Што падкрэсліць, вылучыць, а што пакінуць у ценю. Для адных кактус — гэта калючка, для другіх — цудоўная кветка.

Цяпер вернемся да канкрэтнага выпадку з Ігарам. Я нічога не выдумала, нават не дадумала (хаця гэта дазволены прыём), а строга прытрымлівалася таго, што было, што сапраўды мела месца. (Таму нават без прозвішча вы беспамылкова пазналі Ігара. Па прызнанню яго аднакурсніка, пазналі б нават без імені, калі б я вырашыла прыдумаць іншае ці наогул яго не называць). І ўсё ж... На стале ляжыць пісьмо з дзевятнаццацю подпісамі. Выпакутаванае пісьмо. Дзе кожнае слова — боль за чалавека. У мой адрас — два непрыемныя эпітэты: неабдуманасць і абыякавасць, ды плюс недвухсэнсоўны намёк на патануўшага ў сытасці «нашчадка», які ацэньвае чужую мужнасць з вышыні канапы...

Я шмат думала над вашым пісьмом. І прыйшла да выводу: вы абвінавачваеце мяне хутчэй не ў тым, што напісана, а ў тым, чаго я не напісала, што засталося «за кадрам», чаму не знайшлося месца ў маленькай карэспандэнцыі на сто радкоў. А менавіта: чуласці, сціпласці, дабраце, спагадлівасці свайго бездапаможнага таварыша. Словам, усім тым якасцям, якімі на працягу некалькіх год вучобы карысталіся многія з вас.

Так, страшна меркаваць пра чалавека па адзенню, па займаемай пасадзе, па колькасці «пяцёрак» у залікоўцы ці па любых іншых знешніх праяўленнях. Таму што гэта — не галоўнае. Я сапраўды так думаю і хачу, каб вы паверылі мне. Тое, што ў карэспандэнцыі «Выпадковасць? Заканамернасць» такая простая і зразумелая ісціна не прагучала — і ёсць мая памылка. Напэўна, нешта падобнае здараецца з кожным, хто атрымаў права — так ці інакш, у большай ці меншай ступені — судзіць кагосьці. Каб зменшыць магчымасць памылкі, трэба сто разоў усё ўзважыць. А мы так спяшаемся «выліцца» на газетную паласу...

Гэта да размовы пра чалавека. І калі б я задалася мэтай пісаць толькі аб унутраным свеце Ігара, то паверце: вам не было б у чым мяне папракнуць. Але ў карэспандэнцыі, акрамя ўсяго іншага, размова ішла аб журналістыцы. Не як аб навуцы, заўважце, а як аб паўсядзённым занятку, непасрэдна практыцы. Дарэчы, вы настойліва спрабуеце пераканаць мяне ў тым... у чым я і не думала сумнявацца: неабходнасці якасных ведаў для студэнта і іх дэфіцыце пасля заканчэння ВНУ. Ігар быў (і ёсць) на галаву вышэй за ўсіх нас у гэтых адносінах. Чырвоны дыплом. У будучым, напэўна, аспірантура, выкладанне ў ВНУ...

Але сумнявацца прымушае нешта іншае.

Не так даўно я гутарыла са студэнтамі філасофскага аддзялення гістфака БДУ. Ішла адкрытая размова аб якасці выкладання. І пра аднаго прафесара было сказана: «Ён настолькі разумны, што мы... не знаходзім агульнай мовы з ім. Нават элементарныя рэчы ён тлумачыць складана і заблытана, імкнучыся максімальна выкарыстоўваць свой інтэлектуальны багаж. А можна ж значна прасцей». Гэта адно. І другое.

На апошнім з'ездзе журналістаў БССР у адрас факультэта журналістыкі былі выказаны сур'ёзныя прэтэнзіі. Адна з іх — адсутнасць практычнага вопыту ў часткі выкладчыцкага калектыву, адсюль — бездапаможнасць тэарэтычных выкладак, «мёртвая» тэорыя.

Вы справядліва запярэчыце: рана цяпер расстаўляць кропкі над «і». Магчыма, Ігару не пагражае ні першае, ні другое. Ён будзе цудоўным вучоным без усялякіх «але». «Ніхто не мае права меркаваць пра чалавека, перш чым прыйдзе час збору ўраджаю». Таму давайце пачакаем. Гадоў 20. Пакуль вырасце і паступіць на факультэт журналістыкі новае пакаленне — нашы дзеці. Вось яны і будуць «збіраць ураджай», а заадно і выставяць свае (ужо аб'ектыўныя) адзнакі нашым лекцыям, навуковым працам і газетным публікацыям. У іх і спытаем. А пакуль...

Я ўдзячна ўсім, хто падпісаўся пад пісьмом.

Рада за многіх з вас: урэшце (паводле вашага ўласнага прызнання) адумаліся, навучыліся заўважаць у чалавеку сапраўдныя каштоўнасці. Па-добраму зайздрошчу Ігару. Не ведаю, ці многа знойдзецца сярод нас людзей, на абарону якіх вось гэтак упэўнена і смела стануць не адзін і не двое. Напэўна, гэта і ёсць самае галоўнае ў жыцці.

**Н. СТРАЛКОВА.**

# Прыкладнае палажэнне аб студэнцкім самакіраванні ў Белдзяржуніверсітэце

*праект*



*САМАКІРАВАННЕ... Сёння яно яшчэ робіць першыя, кволыя крокі, хістаецца з боку ў бок, як малое дзіця. Якое будучае чакае яго там, наперадзе?*

*А можа адным з тых, хто будзе па-сапраўднаму ўводзіць яго, стане Аляксандр Зелянкоў? Сёння ён слухач падрыхтоўчага аддзялення, член аператыўнага атрада. Учора змагаўся за лепшае жыццё Афганістана, мае ўрадавыя ўзнагароды. За якую справу возьмецца Саша заўтра?*

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

Паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны мае на ўвазе ўзрастанне патрабаванняў да падрыхтоўкі высокакваліфікаваных, гарманічна развітых і грамадска актыўных спецыялістаў, здольных кампетэнтна і стала вырашаць надзённыя народнагаспадарчыя задачы. Адной з умоў рэалізацыі гэтай задачы на шляху перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з'яўляецца развіццё ў вышэйшых навучальных установах студэнцкага самакіравання, якое выступае актыўнай формай праяўлення дэмакратызацыі савецкай сістэмы навучання. Дамагчыся гэтага можна на аснове грунтоўнага пашырэння правоў студэнцкіх калектываў у галіне арганізацыі навучальнага працэсу, навукова-даследчай работы, прадукцыйнай працы, быту і вольнага часу, адначасова падымаючы іх адказнасць за рэзультаты навучання і грамадскай дзейнасці.

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Студэнцкі калектыў вышэйшай навучальнай установы СССР — аб'яднанне ўсіх студэнтаў, што вучацца ў данай ВНУ, перад членамі якога стаіць задача ў дасканаласці авалодаць выбранай спецыяльнасцю, глыбока засвоіць асновы марксісцка-ленінскага вучэння, прайсці навуковую і практычную падрыхтоўку, набыць навыкі арганізатарскай, выхаваўчай і прапагандысцкай работы.

1.2. У саставе адзінага студэнцкага калектыву ў адпаведнасці з яго структурай і функцыямі ўтвараюцца і дзейнічаюць студэнцкія калектывы факультэтаў, кафедраў, акадэмічных груп. У працэсе навучання саставу групы можа змяняцца па рашэнню дэканата (рэктарата) пры згодзе грамадскіх арганізацый факультэта (ВНУ).

1.3. У вышэйшых навучальных установах ствараюцца і іншыя студэнцкія калектывы — навуковыя, у інтэрнатах, у сферы арганізацыі вольнага часу, прадукцыйнай працы і г. д.

**2. Абавязкі студэнцкіх калектываў**

2.1. Абавязкамі студэнцкіх калектываў з'яўляюцца:

— стварэнне спрыяльных умоў для авалодання ведамі, удзелу ў навукова-даследчай рабоце, працоўнай дзейнасці, арганізацыі быту і адпачынку;

— фарміраванне ў студэнтаў адказных і творчых адносін да вучобы і прадукцыйнай працы, садзейнічанне авалоданню навыкамі прадукцыйнай самастойнай работы і навуковай арганізацыі працы, задавальненню духоўных патрэбнасцей, усебаковаму развіццю асобы, фарміраванню ў членаў калектыву на аснове самастойнасці ў рашэнні пытанняў студэнцкага жыцця актыўнай жыццёвай пазіцыі, навыкаў кіравання дзяржаўнымі і грамадскімі справамі;

— выхаванне ў студэнта пачуцця гаспадара ў сваёй вышэйшай навучальнай установе, павагі да савецкіх законаў, нормаў камуністычнай маралі і правілаў сацыялістычнага супольнага жыцця, стварэнне абставін нецярпімасці да правапарушэнняў, п'янства і іншых антыграмадскіх праяў.

**3. Правы студэнцкіх калектываў**

3.1. Студэнцкія калектывы маюць права прымаць удзел у рашэнні ўсіх пытанняў, якія закранаюць інтарэсы студэнтаў:

— абмяркоўваць пытанні арганізацыі вучэбнага працэсу, навукова-даследчай работы студэнтаў, дзейнасці студэнцкіх будаўнічых і сельскагаспадарчых атрадаў і іншых форм прадукцыйнай працы членаў калектыву, арганізацыі быту, вольнага часу і іншыя пытанні, уносіць па рэзультатах абмеркавання адпаведныя прапановы ў органы адміністрацыі і грамадскіх арганізацый вышэйшай навучальнай установы;

— ставіць перад адміністрацыяй ВНУ пытанне пра замену выкладчыка, які праводзіць заняткі не на належным узроўні;

— уносіць прапановы па размеркаванню бюджэту вышэйшай навучальнай установы.

3.2. Уносіць прапановы адміністрацыі па пытаннях падбору і расстаноўкі адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу, пра заахвочванне ці пакаранне студэнтаў,

— складаць і накіроўваць у дзяржаўную камісію па размеркаванню выпускнікоў спісы чарговасці;

— уносіць прапановы адміністрацыі і грамадскім арганізацыям пра аказанне матэрыяльнай дапамогі студэнтам, па пытаннях размеркавання пуцёвак і іншых матэрыяльна-бытавых ільгот.

3.3. Ствараць камсамольскія стыпендыяльныя камісіі, якія прызначаюць стыпендыі студэнтам з улікам іх паспяховасці, дысцыплінаванасці і ўдзелу ў грамадскай і навукова-даследчай рабоце, ставіць пытанне аб прызначэнні (пазбаўленні) стыпендыі;

— падаваць у экзаменацыйныя камісіі па грамадскіх навуках звесткі пра грамадска-палітычную актыўнасць студэнтаў, вынікі грамадска-палітычнай атэстацыі;

— размяркоўваць месцы ў інтэрнаце, вырашаць пытанні быту, рэжыму, адпачынку, вольнага часу, пражывання ў інтэрнаце, аж да высялення ў надзвычайных выпадках студэнтаў на працягу вучэбнага года.

**4. Правы студэнцкай акадэмічнай групы**

4.1. Апрача правоў, прадугледжаных пп. 3.1—3.3 гэтага палажэння, калектыў акадэмічнай групы мае права:

— выбіраць старасту акадэмічнай групы, рэгулярна заслухоўваць справаздачу пра яго работу, вызваляць яго ад выканання абавязкаў старасты;

— старасты груп першага курса могуць прызначацца дэканам (рэктарам);

— дыферэнцыравана размяркоўваць стыпендыю, рэкамендаваць кандыдатуры для прызначэння на імянныя стыпендыі;

— папярэдне абмяркоўваць і ставіць пытанні пра заахвочванне студэнтаў групы і вынясенне ім спагнанняў, а таксама пра выключэнне з вышэйшай навучальнай установы;

— распрацоўваць праект графіка экзаменацыйнай сесіі з наступным унясеннем на разгляд адміністрацыі і хадайнічаць пра змяненні распарадку заняткаў групы;

— удзельнічаць у рашэнні пытанняў пра найбольш рацыянальнае рассяленне і размяшчэнне студэнтаў групы, у тым ліку сямейных, у інтэрнатах;

— адпускаць студэнтаў з заняткаў па іх заявах.

4.2. Уносіць прапановы ў конкурсную камісію і савет факультэта (ВНУ) перад выбраннем па конкурсу выкладчыкаў, якія праводзяць заняткі ў групе;

— вылучаць кандыдатаў на прысваенне ўсіх відаў імянных стыпендый;

— хадайнічаць аб прадастаўленні членам групы матэрыяльнай дапамогі.

4.3. Прызначаць стыпендыі студэнтам групы і надбаўкі да іх у межах стыпендыяльнага фонду, які выдзелены групе, здымаць у надзвычайных выпадках са стыпендыі і пазбаўляць надбавак на працягу семестра;

— уносіць у савет факультэта прапановы аб рэкамендацыі (не рэкамендацыі) выпускнікоў для навучання ў аспірантуры.

**5. Правы студэнцкага калектыву курса (патоку, аддзялення, кафедры)**

5.1. Акрамя правоў, прадугледжаных пп. 3.1—3.3 гэтага палажэння, студэнцкі калектыў падраздзялення мае права:

— выбіраць старастау курса (патоку) на агульным сходзе студэнтаў на тэрмін 1 год. Пры неабходнасці пытанне аб перавыбранні старасты падраздзялення можа вырашацца і раней вызначанага тэрміну. Стараста I курса (патокаў I курса) можа назначацца дэканам (рэктарам);

— прымаць удзел у вырашэнні пытанняў пра накіраванне студэнтаў на сельскагаспадарчыя і іншыя работы, а таксама пытанняў арганізацыі і правядзення іншых працоўных акцый;

— уносіць прапановы па ўдасканаленню форм правядзення заняткаў у дні, прызначаныя для самастойнай індывідуальнай работы студэнтаў;

— уносіць прапановы па вызначэнню месц праходжання і размеркаванню студэнтаў на вытворчую і педагагічную практыку.

5.2. Уносіць прапановы ў конкурсную камісію і савет факультэта (ВНУ) перад выбраннем па конкурсу выкладчыкаў, якія праводзяць заняткі на курсе.

5.3. Разглядаць пастановы сходаў калектываў акадэмічных груп на адлічэнне студэнтаў з ВНУ;

— дыферэнцыравана размяркоўваць стыпендыяльны фонд паміж групамі з улікам паспяховасці і грамадска-палітычнай дзейнасці, рэкамендаваць кандыдатуры для назначэння на імянныя стыпендыі;

— ажыццяўляць кантроль за наведваннем заняткаў;

— уносіць прапановы пра дазвол на пераздачу экзаменаў.

**6. Правы студэнцкага калектыву факультэта**

6.1. Акрамя правоў, прадугледжаных пп. 3.1—3.3 гэтага палажэння, студэнцкі калектыў факультэта мае права:

— вывучаць і абагульняць прапановы студэнтаў па пытаннях паляпшэння арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, павышэння якасці выкладання і іншых пытаннях, уносіць іх на разгляд савета факультэта, рэкамендаваць студэнтаў у састаў метадычнай камісіі (факультэта);

— удзельнічаць у распрацоўцы плана ідэйна-выхаваўчай работы факультэта сумесна з партыйным бюро, дэканатам факультэта;

— у выпадку неабходнасці ўзнімаць пытанне перад дэканатам аб правядзенні сумесных сходаў студэнтаў і прафесарска-выкладчыцкага калектыву факультэта.

6.2. Удзельнічаць у арганізацыі агляду-конкурсу вучэбных груп, на аснове прынцыпу калектыўнай адказнасці дыферэнцыравана размяркоўваць стыпендыяльны фонд паміж калектывамі факультэта з улікам вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва і выканання калектыўных сацыялістычных абавязацельстваў;

— заахвочванне лепшых груп і груп, якія выканалі калектыўныя сацыялістычныя абавязацельствы, праводзіцца за кошт стыпендыяльнага фонду;

— рэкамендаваць лепшых студэнтаў факультэта для прызначэння імянных і павышаных стыпендый па прадстаўленню калектываў груп;

— прымаць удзел у размеркаванні паміж курсамі, групамі аддадзеных факультэту месц для пражывання ў студэнцкім інтэрнаце;

— выносіць рэкамендацыі па пытаннях выбрання дэкана і яго намеснікаў.

6.3. Вылучаць сваіх прадстаўнікоў у састаў вучонага савета факультэта і конкурснай камісіі па выбранню прафесарска-выкладчыцкага саставу.

**7. Правы студэнцкага калектыву ВНУ**

7.1. Акрамя правоў, прадугледжаных пп. 3.1—3.3 гэтага палажэння, калектыў вышэйшай навучальнай установы мае права:

— узнімаць пытанне аб справаздачы адміністрацыі ВНУ пра рашэнні, якія прыняты па прапанове студэнцкіх калектываў і іх органаў;

— зацвярджаць палажэнне аб студэнцкім самакіраванні ў ВНУ, разглядаць і ўносіць у яго змены.

**8. Арганізацыйныя пытанні**

8.1. Агульнае кіраўніцтва сістэмай студэнцкага самакіравання ў ВНУ ажыццяўляе камітэт ВЛКСМ і прафсаюзны камітэт студэнтаў.

Студэнцкія калектывы рэалізуюць дадзеныя ім правы непасрэдна на сходах студэнцкіх калектываў (сходаў прадстаўнікоў).

У перыяд паміж сходамі паўнамоцтвы студэнцкіх калектываў ажыццяўляе савет студэнцкага калектыву.

Савет фарміруецца з прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый: у групе — камсорг, прафорг, стараста; на патоку — камсорг, стараста, член прафбюро; на факультэце — сакратар камітэта камсамола, старшыня прафбюро, старшыня ВВК, старшыня (член) студсавета інтэрната, стараста курса (патоку, аддзялення, кафедры); ва універсітэце — сакратар камітэта камсамола, старшыня прафкома студэнтаў, дырэктар студгарадка, намеснік сакратара камітэта камсамола па вучэбнай рабоце, старшыня савета выдатнікаў універсітэта.

Ва ўстаноўленым парадку рэалізуюцца правы, якія дадзены студэнцкім арганізацыям у навукова-даследчай рабоце, інтэрнаце, у студэнцкіх атрадах, у сферы арганізацыі вольнага часу і іншых формах пазавучэбнай дзейнасці.

Праект палажэння выносіцца на абмеркаванне сходаў студэцкіх калектываў, а потым зацвярджаецца на адкрытым камсамольскім сходзе (канферэнцыі) студэнтаў і рэктара універсітэта.

З мэтай апрабацыі ў другім семестры 1986—1987 навучальнага года элементы студэнцкага самакіравання ўводзяцца на шэрагу факультэтаў, студэнцкія інтэрнаты №№ 1, 4 пераводзяцца на самакіраванне.

Студэнцкае самакіраванне ўводзіцца на ўсіх факультэтах універсітэта і ў інтэрнатах з 1 верасня 1987 года.

Ход і вынікі ўкаранення самакіравання шырока асвятляюцца ў газеце «Беларускі універсітэт», факультэцкім насценным друку.

Адказнасць за стан спраў, рэалізацыю прынятых рашэнняў нясе камітэт ВЛКСМ і прафком студэнтаў.

**9. Узаемаадносіны з адміністрацыяй**

9.1. Адміністрацыя ВНУ абавязана перыядычна або па патрабаванню савета студэнцкага калектыву інфармаваць студэнцкія калектывы па важных пытаннях, пералічаных у пп. 3, 4, 5, 6. Узгадняць свае дзеянні або прымаць сумесныя рашэнні з органамі грамадскіх арганізацый па пытаннях, пералічаных у пп. 3.2, 3.3, 4.2, 5.2, 6.2.

Рашэнні калектываў студэнтаў, іх органаў або органаў грамадскіх арганізацый па пытаннях, пералічаных у пп. 4.3, 5.3, 6.3, 7, могуць прымацца самастойна. У выпадку нязгоды адміністрацыі з прынятым рашэннем пытанне разглядаецца паўторна або выносіцца на адкрыты камсамольскі сход для абмеркавання і прыняцця пастановы.

У выпадку парушэння правоў калектываў студэнтаў з боку адміністрацыі і яе органаў або немагчымасці іх рэалізацыі органы грамадскіх арганізацый могуць звяртацца ў партыйныя, вышэйстаячыя гаспадарчыя органы з мэтай абароны сваіх інтарэсаў. Да адмены рашэння вышэйстаячымі органамі або яго змянення прынятае рашэнне ўваходзіць у сілу і з'яўляецца абавязковай для выканання.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Ко...
26 лютага 1987 года
АТ 06290. Зак. 252

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.